Паелі і сагрэліся ўсе, але адной бутэлькі віна аказалася мала, і Адам, накінуўшы на плечы куртку, падаўся ў магазін, што быў размешчаны на першым паверсе іхняга дома.

З таго часу вячэры з віном у сям'і Лабаноўскіх сталі амаль што традыцыяй. Зімой нібыта грэліся, але нават і калі прыйшла вясна ды наўкола стала горача, яны гэтай традыцыі не парушалі. У выніку такіх застолляў Вераніка з горам папалам закончыла базавую школу. У 10-ы клас яе настаўнікі не ўзялі, што называецца, сцяной сталі супраць гэтага ўсе да аднаго.

— У нас і так праблем хоць адбаўляй, а тут яшчэ з малалетняй алкагалічкай валэндайся, — рэзонна заўважыў дырэктар. — Няхай ідзе на ўсе чатыры бакі.

І Вераніка пайшла. Толькі не на ўсе чатыры, а на адзін: у раённым гарадку, што быў непадалёку ад пасёлка, яе прыгрэў ля сябе адзінокі пажылы прадпрымальнік. Нібыта за служанку трымаў, але ўся ваколіца ведала, якую службу там несла дзяўчына.

Днём, калі гаспадар ад'язджаў з дому па справах, Вераніка збірала сабе падобных, і яны наладжвалі такія оргіі, што ў людзей, якія гэта бачылі і чулі, валасы на галаве ўставалі дыбам. Спачатку той прадпрымальнік не слухаў людскіх кпінаў і нараканняў, але потым сам перакананаўся, застаўшы разбэшчаную кампанію ў самы разгар вясёласці. І ён прагнаў усіх прэч. У тым ліку і Вераніку. Падацца ёй не было куды, бо рабіць нічога не ўмела і не хацела. Вярнулася ў бацькоўскую кватэру, дзе п'янкі-гулянкі да таго часу дасягнулі, можна сказаць, свайго апагею. Бацькі нідзе не працавалі, бо іх адусюль праганялі за шчырае пакланенне Бахусу. Найдаўжэй маглі патрымацца да першай зарплаты ці авансу. А потым пілі і прагульвалі. З імі стараліся як мага хутчэй развітацца, хоць рабочых рук у пасёлку не хапала.

Адам з Кацярынай жылі тым, што збіралі бутэлькі, а потым здагадаліся шантажыраваць таго пажылога прадпрымальніка, маўляў, калі не будзеш плаціць грошай, то напішам у міліцыю заяву, што ты займаўся любошчамі з нашай непаўнагадовай дачкой. А за гэта па лысай галаве не пагладзяць. І той чалавек кожны месяц плаціў ім грошы, нібыта зарплату, справядліва палічыўшы, што, як кажа народная прымаўка: "Бойся быка спераду, каня ззаду, а дурня з усіх бакоў".

Мала таго, што пілі ўсёй сямейкай, то яшчэ і курылі. І аднойчы кабета з суседняга дома, якая ўстала ноччу папіць вады, убачыла ў акне зарыва. З жахам яна зразумела, што гарыць кватэра Лубаноўскіх. Стаяла лета, акно яны нанач не зачынілі, можа, па п'яні не да таго было, і полымя ўжо шугала вонкі, лізала сцяну той кватэры, што была паверхам вышэй, распаўзалася ў бакі, нібыта шчупальцы вогненнага спрута. Яна кінулася выклікаць пажарных, будзіць людзей. Пазваніла ў "хуткую дапамогу", хоць мела мала надзеі, што нехта яшчэ застаўся жывы ў такім пажары.

І сапраўды, у жывых не засталося нікога. Адам і Кацярына абгарэлі да такой ступені, што іхнія трупы цяжка было апазнаць. Відаць, менавіта з іхняй спальні ўсё і пачалося. А Вераніка проста задыхнулася ў дыме.

Пасёлак доўгі час быў у шоку ад такой трагедыі. Людзі пераказвалі адзін аднаму жудасныя падрабязнасці, уносілі свае версіі. Толькі ўсе сыходзіліся на адным: сям'я загінула з-за алкагольнага пажару, які пачаўся шмат гадоў таму і разгараўся, набіраў сілу, каб знішчыць і людзей, і маёмасць, нажытую нялёгкай працай. Усё, як кажуць, пад корань...

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ.

Гродзенская вобласць.

SOS!

По закону — можно, на деле — никак

Решением суда я и моя сестра М.И.Бойцова формально выселены из жилого дома, подлежащего сносу в связи с изъятием земельного участка для госнужд, и обе фиктивно вселены в одну двухкомнатную квартиру. А в ней метраж одной жилой комнаты — 13 кв. метров, а другой — 18 кв. метров. Что, по решению суда, соответствует равным долям, не ущемляет жилищные стандарты, прописанные ст.81 Жилищного кодекса Республики Беларусь, где указан метраж жилого помещения на одного собственника от 15 до 20 метров квадратных. Решение вынесено и без учета того, что в настоящее время я и сестра — это не одна семья.

Суд не реализовал нормы ч.2 ст.104 ЖК РБ, ч.2 и ч.3 п.9 Положения, утвержденного Указом Президента Республики Беларусь от 27.12.2007 г. №667, который гарантирует собственнику жилого дома, подлежащего сносу в связи с изъятием земельного участка для госнужд, два права: в частности, право самому выбрать вариант вида компенсации за дом, подлежащий сносу, и право получить в собственность отдельную однокомнатную квартиру или дом жилой площадью от 15 до 20 квадратных метров.

Суд навязал нам с сестрой свой вариант компенсации: одна двухкомнатная квартира на двоих. Генпрокуратура вынесла протест на это решение, Верховный суд его отклонил. Все! Тупик!

Цепи судебного бюрократизма может разорвать только гарант Конституции Республики Беларусь А.Г.Лукашенко, и только он обязан реализовать в жизнь ч.2 и ч.3 п.9 Положения, утвержденного указом Президента Республики Беларусь. Но иначе, как через газету, до Александра Григорьевича не достучаться.

Валентина Иосифовна ВОЛЧЕЦКАЯ.

Минск.

КОРОТКО

Главным событием Рождества стало выступление Папы Римского

По традиции он призвал к восстановлению “мира и стабильности” на Святой Земле через возобновление диалога между израильтянами и палестинцами. “Господь помогает раненому человечеству во многих конфликтах, которые все еще обагряют кровью нашу планету”, — отметил понтифик Бенедикт XVI.

Папа помолился также за прекращение насилия в Сирии, где “уже пролито много крови”, а также за воцарение стабильности в Ираке и Афганистане и пожелал восстановления всем странам Северной Африки и Ближнего Востока, затронутых “арабской весной”.

Главным событием в Москве стал митинг на проспекте Сахарова с лозунгом «За честные выборы»

Организаторам удалось собрать, по разным оценкам, от 70 до 120 тысяч человек, и тем самым этот митинг стал самой многочисленной протестной акцией последнего двадцатилетия. Впрочем, официальные оценки ГУ МВД по столице гораздо скромнее — до 30 тысяч, как передал “Интерфакс”. Наблюдатели и СМИ указывают, что эту цифру можно опровергнуть простейшими расчетами.

Массовые митинги протеста под общим лозунгом “За честные выборы” состоялись и в других городах России, участники которых требуют пересмотра результатов парламентских выборов, состоявшихся 4 декабря.

В ходе митинга на проспекте Сахарова в Москве лидеры оппозиции приняли резолюцию с требованиями в адрес правительства, включая увольнение главы Центризбиркома Владимира Чурова и отмену итогов выборов, которые оппозиционеры считают фальсифицированными. Кроме того, демонстранты требуют освободить всех политзаключенных, изменить законодательство о регистрации партий и создать специальную комиссию для расследования нарушений на выборах. Последним пунктом в резолюции стал призыв не отдать Владимиру Путину ни одного голоса на выборах 4 марта 2012 года.

Крупный теракт в Афганистане

Террорист-смертник совершил самоподрыв во время погребальной церемонии в афганской провинции Тахар. 22 человека погибли, около 50 пострадали. По данным местных властей, среди погибших депутат афганского парламента уроженец Узбекистана Муталиб Бег, в прошлом — один из командующих Объединенного исламского фронта спасения Афганистана, боровшегося против движения “Талибан”. По всей вероятности, именно он был целью организаторов теракта.

15-летний американский подросток Джордан Ромеро стал самым юным в истории покорителем высочайших вершин шести континентов

Обладателем прежнего рекорда был британец Джордж Аткинсон, который завершил серию восхождений в возрасте 16 лет в мае.

Ромеро благополучно достиг вершины пика Винсон (4892 метра) в Антарктиде, о чем сообщил своей матери и в собственном блоге в социальной сети Facebook. Он покоряет высочайшие горы континентов вместе с отцом и мачехой, являющимися опытными альпинистами.

Теперь в активе подростка семь гор, включая высочайшую точку Африки — Килиманджаро (5895 метров) и высочайшую вершину мира — Эверест (8850 метров). Их он покорил в 10 и 13 лет соответственно.

Ким Чен Ын провозглашен главой ЦК Трудовой партии Кореи

Ежедневная северокорейская газета “Нодон синмун”, центральный орган Трудовой партии Кореи, назвала Ким Чен Ына, сына покойного северокорейского лидера Ким Чен Ира, главой Центрального комитета партии. Ранее Ким Чен Ын был провозглашен главнокомандующим вооруженных сил КНДР.

Таким образом, младший сын Ким Чен Ира, 27-летний Ким Чен Ын, становится полновластным руководителем Северной Кореи.

Традиционное рождественское выступление королевы Елизаветы II было посвящено семье

Семье в широком смысле слова как опоре в тяжелые времена.

Ее Величество писала сама. Телеобращение было записано 9 декабря, и в нем королева коснулась также темы свадьбы ее внука принца Уильяма, состоявшейся в апреле, а также юбилея ее супруга, которому в июне исполнилось 90 лет.

Первая группа наблюдателей Лиги Арабских государств прибыла в Сирию, чтобы контролировать действия властей страны в отношении оппозиции

Всего в Сирию должны прибыть около 200 наблюдателей. Они намерены встретиться с представителями различных организаций, включая оппозиционные. В ходе антиправительственных выступлений, которые продолжаются в Сирии уже несколько месяцев, погибли приблизительно 5 тыс. человек.

Католические церкви в Нигерии стали мишенями террористов на Рождество

Общее число жертв составляет несколько десятков. Ответственность за теракты взяла на себя радикальная исламистская группировка “Боко харам”, которая стремится к искоренению западного образа жизни и установлению шариата на всей территории страны.

Во втором туре выборов президента самопровозглашенной республики Приднестровье победу одержал Евгений Шевчук

Второй тур выборов президента Приднестровской молдавской республики прошел 25 декабря. В нем участвовали бывший председатель парламента республики Евгений Шевчук и действующий спикер Анатолий Каминский, набравшие большинство голосов в первом туре. Шевчук тогда получил 38,55 процента голосов, а Каминский — 26,3 процента. Президент Игорь Смирнов, возглавляющий Приднестровье с 1991 года, во второй тур не прошел.

Хор солдатских жен

Хор, в котором поют жены британских военных, служащих в Афганистане, в этом году возглавил рождественский хит-парад, обогнав победителей популярного британского телешоу X Factor.

Лишь за одну прошлую неделю было продано 556 тысяч копий сингла “Где бы ты ни был” . Это больше, чем продажи остальных участников первой дюжины хит-парада вместе взятых, заявляет компания-составитель рейтинга.

СТОП-КАДР!

Как мир отметил Рождество Христово



В Таиланде оно было достаточно традиционным.



На базе Манас в Кыргызстане американские военные организовали рождественский парад.



В Барселоне прошел традиционный рождественский заплыв с участием Санта-Клауса.



В Багдаде в эти дни церкви охраняли местные силы безопасности на случай нападения боевиков.

ГЛАЗАМИ ОЧЕВИДЦА

Александр Лукашенко выразил соболезнования в связи со смертью северокорейского лидера Ким Чен Ира, но забыл направить слова поддержки чешскому народу в связи со смертью авторитетнейшего европейского политика, бывшего президента Чехии Вацлава Гавела. Каждый, конечно, вправе сам выбирать себе компанию и политические ориентиры, но мы решили все-таки опубликовать рассказ очевидца о том, до какого состояния довел свою страну диктатор, о смерти которого скорбит белорусский вождь.

Публикуем рассказ ***Андрея Илларионова****, бывшего помощника президента России, о визите в эту страну российской делегации в июле 2000 года.*

Концлагерь для 24 миллионов

Во время встречи российской делегации 17 июля 2000 г. в Пхеньяне вдоль пути следования кортежа от аэропорта до центра города на протяжении примерно 10—15 км по обеим сторонам дороги были выстроены сотни тысяч людей (по оценкам российских наблюдателей — не менее 700 тысяч, по официальным северокорейским данным — около 1 миллиона).

Кортеж двигался медленно, неоднократно останавливаясь, — говорили, что первая машина, в которой ехали лидеры двух стран, делала остановки в тех местах, где коллективы народного творчества исполняли очередной танец ликования.

Подавляющее большинство людей, выстроенных вдоль трассы, составляли женщины, одетые в национальные корейские платья светлых цветов — преимущественно розовых и голубых оттенков, а также дети.

Мужчин практически не было — может быть, процентов десять от общего числа. На ногах у женщин — что-то вроде тапочек, сделанных из пластмассы. Женщины были чудовищной худобы и почти одинаковой конституции. Возраст многих женщин было совершенно невозможно определить. Лица большинства из них напоминали черепа, обтянутые тонкой, совершенно иссушенной, часто растрескавшейся, серо-коричневой кожей. Первая мысль, пришедшая немедленно в голову, — что в рационе питания этих людей совершенно нет жиров — даже не столько мяса, сколько жиров. В России (да и в других странах) таких лиц никогда не видел.

Передний ряд женщин стоял строго на границе проезжей части дороги, за ним — несколько следующих рядов.

При приближении к центру города количество рядов увеличивалось, и плотность встречающих возрастала. Перед первым рядом женщин примерно в метре-полутора от него и на расстоянии примерно 20—30 метров друг от друга лицом к женщинам (и, соответственно, спиной к проезжающим машинам) стояли цепью крепкого вида мужчины в темной одежде. За последним рядом женщин располагалась еще одна цепочка мужчин в темной одежде. Их было видно хуже.

Женщины улыбались, рукоплескали проезжавшим машинам, размахивали платочками, яркими плакатиками, скандировали что-то на корейском языке и ПОДПРЫГИВАЛИ.

Это трудно представить сейчас, это нелегко было видеть и тогда. Они постоянно ПОДПРЫГИВАЛИ.

Колонна в очередной раз остановилась — очевидно, впереди очередной народный ансамбль исполнял новый красивый народный танец.

“Мерседес” 1952 года выпуска, в котором ехал я, шел одним из последних в кортеже. Мы стояли, возможно, уже минут 10 или 15, окруженные с обеих сторон несколькими сотнями непрерывно подпрыгивавших женщин. Момент счастья встречи, предполагавшийся по замыслу организаторов, очевидно, длительностью в несколько секунд проезда кортежа автомобилей, явно затягивался. Женщины, продолжавшие все это время ПРЫГАТЬ и выражавшие таким образом свое ликование по поводу приезда лучших друзей северокорейского режима, начали, видимо, уставать. Их прыжки постепенно становились реже и ниже.

Одна из женщин в первом ряду, видимо, не совершила очередного, полагавшегося по ритму, прыжка или сделала его не совсем высоким.

Тогда стоявший перед ней и немного наискосок от нее мужчина в темной одежде молниеносно сорвался с места и кулаком нанес мощный удар ей прямо в лицо. Тело несчастной отлетело метра на два и опрокинулось на женщин, стоявших в следующих рядах. От такого удара не поднимаются — мелькнула у меня мысль. И еще одна: ее сейчас отнесут в сторону и положат где-нибудь под дерево.

К моему глубочайшему изумлению и ужасу, буквально через несколько секунд эта женщина, оттолкнутая стоявшими сзади другими женщинами, вернулась на свое место и стала прыгать еще более исступленно и, как мне показалось, еще более высоко и с еще более безумно-радостной улыбкой на лице.

Тут и другие женщины вокруг стали улыбаться еще сильнее и прыгать еще энергичнее.

Я заметил, что мужчины за задними рядами женщин тоже пришли в движение, причем в руках у них обнаружились палки (или дубинки), на которых до этого момента не обращал внимания.

По каким частям тела приходились удары — видно не было. Однако судя по тому, что задние ряды пришли в совершеннейшее неистовство энтузиазма, похоже, что работа проводилась не напрасная.

Сопровождавшая нас в машине миловидная сотрудница северокорейского МИД отвернулась от окошка, к которому были прикованы взгляды всех сидевших в машине, и в очередной раз заговорила о том, как весь корейский народ искренно любит своего Дорогого Лидера.

Вскоре кортеж тронулся с места и двинулся дальше.

СЛЫШАЛИ?

О пользе честных выборов и сменяемости власти

Умер лидер Северной Кореи Ким Чен Ир. Трудовая партия Кореи находится там у власти уже 65 лет, регулярно получая на выборах больше 99% — прямо как КПСС в СССР.

Рядом находится Южная Корея. Сначала там было все примерно как на Севере — бессменно правил страной Ли Сын Ман. В 1960 году он четвертый раз пытался переизбраться президентом и по официальным данным одержал “убедительную победу”. Однако народ не поверил результатам выборов, на улицы вышли тысячи демонстрантов, и случилась “апрельская революция”.

В результате в Южной Корее установился конкурентный политический режим — голоса считают честно, партии сменяются у власти по итогам выборов. Не то, что в Северной Корее.

А теперь почувствуйте разницу между двумя корейскими государствами, которая образовалась всего лишь за два поколения (60 лет):

Показатель	Южная Корея	Северная Корея
Население, млн чел.	48,8	24,5
Продолжительность жизни, лет	79,1	68,9
Детская смертность, на 1000	4,2	27,1
ВВП на душу населения, $	27.800	1800
Выработка электроэнергии, млрд.квт.ч.	417,3	22,5
Пользователей интернета, млн	39,4	Нет данных

Отсюда мораль: если хотите жить долго, достойно, при свете и с интернетом — добивайтесь ЧЕСТНЫХ ВЫБОРОВ!

Борис НАДЕЖДИН,
российский политик.

Народная Воля http://www.nv-online.info 27 СНЕЖНЯ 2011 г.

КАНФЛІКТ

Жыццё ў пясок

Па галоўных вуліцах вёсак Ванькаўшчына і Лысаўшчына, якія знаходзяцца недалёка ад спартыўнага комплексу "Стайкі", у хуткім часе кругласутачна пачнуць хадзіць грузавікі. Ужо пачалося будаўніцтва дарогі, якая будзе шчыльна прылягаць да платоў хатніх гаспадарак. Некаторым нават давядзецца перамясціць частку плота, бо дарога пойдзе праз агарод. Ці ў нашай краіне зямлі мала, ці людзі ўжо нічога не вартыя? Чаму дарогу для грузавікоў кладуць... пад самымі вокнамі?..

Прычына вельмі простая. Пясчаны кар'ер, які быў у некалькіх кіламетрах ад вёсак, закрываюць, а новы кар'ер вырашана зрабіць літаральна за Лысаўшчынай. Дарогу да яго пракладваюць па прынцыпе "як прасцей". Нікога не хвалюе і не цікавіць, як пад пыл і грукатанне грузавікоў будуць жыць людзі.

Лысаўшчына знаходзіцца ў маляўнічым месцы на беразе Свіслачы. Цяпер там будуецца мост, каб грузавікі з пяском маглі праехаць да новага кар'ера. Людзі сабралі больш за 70 подпісаў, звярталіся ва ўсе інстанцыі, у тым ліку і ў Адміністрацыю Аляксандра Лукашэнкі, патрабуючы спыніць будаўніцтва дарогі праз вёскі. Людзі прасілі чыноўнікаў аднавіць старую даваенную дарогу, якая знаходзіцца непадалёку, — ездзячы па ёй, машыны нікому не будуць перашкаджаць. Але да каго ў Беларусі можа дакрычацца просты чалавек?

Мясцовы жыхар **Генадзь Сянюта** паставіў свой подпіс сярод іншых, хто скардзіўся ў шматлікія інстанцыі. "*Разумееце, для іх гэта самы просты шлях. Пра людзей ніхто не думае. Наадварот, нам цынічна адказалі, што вось гэтае будаўніцтва адбываецца з мэтай... паляпшэння транспартных зносін паміж вёскамі!..*

Вунь на тым беразе рэчкі знаходзіцца маленькая вёска, і на яе на ўсю добра калі ёсць тры аўтамабілі. А будаўніцтва моста будзе каштаваць каля 8 мільярдаў рублёў, ды яшчэ на гэты ўчастак дарогі каля 15 мільярдаў закладзена. Скажыце, які клопат! У час крызісу не шкада ім такіх фінансавых сродкаў для маленькай вёсачкі, якой, дарэчы, гэтая дарога проста да лямпачкі! Насамрэч, усё тут даволі проста. Інвестару патрэбны пясок для будаўніцтва. І навошта яму нешта аднаўляць, калі можна ехаць праз дзве вёскі, і няважна, як там людзям будзе. Напляваць на народ зусім", — абураецца спадар Сянюта.

У Лысаўшчыне засталося няшмат карэнных жыхароў. Старажыламі тут лічаць тых, хто гадоў 20 таму пасяліўся ў вёсцы як дачнік. Людзі набылі ўчасткі, знеслі старыя дамы, пабудавалі новыя. Некаторыя зрабілі рэканструкцыю дамоў сваіх бацькоў, якіх ужо няма ў жывых. Асноўны кантынгент — гэта пенсіянеры.

"*Ведаеце, мы ж жылі ў Мінску,* — расказвае мясцовая жыхарка **Алена Новікава**. — *Але я кватэру пакінула дзецям, цяпер яны ўсе да мяне сюды прыязджаюць. Унукі ўсё лета са мной. І што цяпер? Туды-сюды дзень і ноч міма вокнаў будуць хадзіць самазвалы з пяском?! Чаму нас ніхто не хоча слухаць? Я ўжо маўчу, што ўсё бліжэй да нашых вёсак падбіраюцца адстойнікі з каналізацыяй. Калі адтуль вецер дзьме, то пах — самі адчуваеце які. А цяпер яшчэ і гэта. Што нам рабіць?.. Якое выйсце?.. Яны думаюць, што калі мы пенсіянеры, то нам ужо нядоўга на гэтым свеце і так засталося?.. Мо і так. Вунь, могілкі побач, далёка нас несці не давядзецца".*



Па гэтай вуліцы будуць кругласутачна ездзіць грузавікі.



Алена Новікава абураецца...

Сусед Алены **Аляксандр Буры** ледзь стрымлівае слёзы: "*Бачыце, як яны пачалі падрыхтоўку? Я пасадзіў з зярняткаў алею каштанаў. Дрэўцы падраслі ўжо, сталі прыгожымі маладымі дрэвамі... Спілавалі і ўсё! Нават не папярэдзілі. Вось тут шыпшына ўздоўж плота на вуліцы была — і з ёй тое ж... Так крыўдна! Я нават заплакаў, калі ўбачыў. Як жа так можна? Вунь у самым цэнтры вёскі могілкі. Там ёсць пахаванні польскія ад 1903 года. Дык яны плануюць ЛЭП праз могілкі. Значыць, і там спілуюць усе дрэвы. Ды што дрэвы?! Бачыце, вунь разметку ўсталявалі — будуць частку могілак зносіць. А што ім? Тым больш што няма ў жывых ужо і дзяцей тых, каго там пахавалі. У нас ніхто і пра жывых людзей не думае, а тут нябожчыкі..."*



Будоўля моста.

Карэнная жыхарка, калісьці член зборнай СССР па лыжах, а цяпер пенсіянерка **Галіна Окур** з боем запісалася на прыём у Адміністрацыі Аляксандра Лукашэнкі. *"Спачатку мяне не хацелі запісваць, але я тады сказала, што буду звяртацца праз Спорткамітэт — як ветэран спорту. Ледзь запісалі. Але на прыём я ўсе роўна не патрапіла. Гэта ж трэба! Так перажывала з-за гэтай сустрэчы, што за дзень да прызначанай даты мне стала кепска і ўрачы забралі мяне ў шпіталь. Нават не ведаю, што цяпер будзе. У нас тут вялікая праблема заўсёды была (нават калі яшчэ мае бацькі жылі) — гэта вада. Дастаткова было невялікага дажджу — і нас затаплівала. Што мы толькі не рабілі! Нарэшце пасадзілі невялікі парк, і дрэвы сталі замінаць вадзе. Там паставілі стол для тэніса, баскетбольныя карзіны павесілі, зрабілі турнікі... Уся моладзь там збіралася. А цяпер гэтыя будаўнікі прыехалі і, нікому нічога не кажучы, за пару гадзін спілавалі дрэвы. Усё знішчылі! І гэта ж толькі пачатак. Глядзіце, які катэдж прыгожы. Чалавек набыў яго для сваёй сям'і, у самым маляўнічым месцы... Раптам прыязджае, а каля дома — пустыр, бруд, нейкія шлангі, бульдозеры... Пад самы плот яму ўсё побач знішчылі. Проста шкада чалавека, ён жа такія грошы заплаціў!.."*

Не часта ў Беларусі можна сустрэць людзей, якія гутараць з журналістам эмацыянальна, ахвотна і адкрыта. Тут не тая сітуацыя. У людзей сапраўды накіпела.

Да нашай размовы далучаецца **Валянціна Бурая**: "*Мы ўсе грошы некалі трацілі, каб пабудаваць тут дамы, упрыгожылі ўсё вакол, пасадзілі дрэвы... Сюды нашы ўнукі прыязджаюць, дзеці. А цяпер мы ўжо пенсіянеры, і пабудаваць дом у іншым месцы мы проста не ў стане. І сіл ужо няма, і грошай такіх няма. Гэтыя дамы прадаць можна толькі вельмі танна: хто ж захоча, каб смярдзела фекаліямі ды яшчэ міма вокнаў грузавікі шмыгалі?.. Зараз нам сказалі, што стары кар'ер будуць каналізацыяй запаўняць. Маўляў, такім чынам рэльеф раўняюць. Ну як змагацца? І з гэтай дарогай проста бяда! Улады даюць нейкія адпіскі, хаця значна танней было б аднавіць даваенную дарогу. Але танней для іх не значыць прасцей. Вось гэта сапраўды яскравы прыклад клопату пра народ".*

Пакуль мы размаўлялі з абуранымі вяскоўцамі, з'явіліся і будаўнікі. Слова — за слова... Мае суразмоўцы пачалі распытваць, ці хутка правядуць гэтую дарогу. Тыя паведамілі, што адказваюць толькі за будаўніцтва моста праз рэчку. Сказалі, што павінны паспець за пяць месяцаў. І раптам пачалі спачуваць людзям...

Сапраўды, сталіцы патрэбны пясок для будоўляў. Зразумела, што для эканомікі лепш, каб кар'еры распрацоўваліся як мага бліжэй да горада. Жыхары гэта самі добра разумеюць і не супраць, каб за рэчкай працаваў кар'ер. Яны толькі просяць зрабіць туды іншую дарогу. Але ніхто не гатовы іх пачуць... Ніхто нават не хоча іх пачуць!

Любоў ЛУНЁВА.

РЭГІЁНЫ

Адмова ад дактыласкапіі па рэлігійных прычынах

Жыхар Брэста не хоча, каб нехта "завалодаў яго фізічным і духоўным станам".

Мужчына можа атрымаць штраф ці нават адміністрацыйны арышт за тое, што не жадае "адкатваць" пальцы. Пры гэтым Віталь К. калісьці нават быў узнагароджаны за дапамогу ў выкрыцці злачынцы. Жыхар абласнога цэнтра матывуе сваё нежаданне праходзіць працэдуру дактыласкапіі рэлігійнымі прычынамі.

"Кожны палец на руцэ адказвае за які-небудзь орган, за мозг у тым ліку, — тлумачыць Віталь. — *Узор на пальцах кожнага чалавека ўнікальны. Узяўшы ў мяне адбіткі пальцаў, з'яўляецца магчымасць валодаць мной і маім фізічным і духоўным станам. Гэта парушае мае рэлігійныя асновы"*.

У знак добрай волі Віталь нават здаў у міліцыі аналіз ДНК. Ён пагадзіўся б і на сканіраванне сятчаткі вока, але такую працэдуру ў беларускай міліцыі рабіць пакуль не навучыліся.

Самае галоўнае, мужчына нагадвае пра тое, што пальцы ў яго ўжо "адкаталі". Якраз тады, калі ён затрымаў злодзея. Дык навошта паўторная працэдура?

У Гродне квітнее небывалая расліна

Кветка аморфафалус упершыню заквітнела на захадзе Беларусі.



Асаблівасцяў у гэтай расліны вельмі шмат: напрыклад, аморфафалус уваходзіць у пяцёрку самых дзіўных кветак свету. Самая яркая асаблівасць — рэзкі і даволі непрыемны пах. Гаспадыня кветкі — супрацоўніца гродзенскага прадпрыемства — нават атрымала наганяй ад кіраўніцтва за непрыстойны пах на працоўным месцы. Дзіўная кветка вырасла з цыбуліны, якую гаспадыні падаравала сяброўка.

У Мядзелі пабудуюць гатэль на пяць зорак?

Сучасны гасцінічны комплекс павышанай камфортнасці пабудуюць у 2012 годзе ў Мядзелі.

Гэты аб'ект уключаны ў абласную інвестыцыйную праграму. Гасцініца разлічана на 100 месц. Дарэчы, у развіццё Нарачанскага краю будзе ўкладзена больш за 118 мільярдаў рублёў. У строй увядуць новыя аб'екты аграэкатурызму, вакзал, пашыраць санаторна-курортную базу.

Бог дапаможа...

Дабудаваць дадатковыя карпусы для Браслаўскага абласнога падлеткавага сухотнага рэабілітацыйнага цэнтра віцебскім уладам дапаможа Ватыкан.

У лісце, які прыйшоў у Віцебскі аблвыканкам, гаворыцца пра тое, што Ватыкан у наступным годзе мае намер прафінансаваць будаўніцтва новых карпусоў і дапаможа набыць неабходнае абсталяванне.

Дадатковае фінансаванне дазволіць у два разы павялічыць колькасць месцаў у сухотным цэнтры. Палепшацца і ўмовы ўтрымання дзяцей.

Рэгіянальную падборку склала Марыя МАЛЕВІЧ.

ЧУЛІ?

На паўстагоддзя старэйшая

Нацбанк прыняў рашэнне аб змяненні пачатковай даты ў гісторыі банкаўскай сістэмы Беларусі

Праўленнем Нацыянальнага банка прынята рашэнне аб змяненні пачатковай даты ў гісторыі банкаўскай сістэмы Беларусі.

Дагэтуль датай стварэння банкаўскай сістэмы ў Беларусі было прынята лічыць 3 студзеня 1922 года — дату пачатку працы ў Мінску Беларускай канторы Дзяржбанка пры Наркамаце фінансаў Беларускай ССР.

"Аднак праведзеныя даследаванні архіўных матэрыялаў, вывучэнне калекцый фінансавых дакументаў і каштоўных папер дазволілі атрымаць неабвержныя дакументальныя сведчанні таго, што першая банкаўская ўстанова на тэрыторыі сучаснай Беларусі з'явілася як мінімум на паўстагоддзя раней, а іменна: 8 студзеня 1870 года, калі быў падпісаны Указ Сената Расійскай Імперыі аб заснаванні ў Гомелі гарадскога грамадскага банка. З гэтага часу і бярэ свой пачатак гісторыя станаўлення і развіцця банкаўскай сістэмы Беларусі", — паведамілі ва ўпраўленні інфармацыі Нацбанка.

Там патлумачылі, што пасля адмены ў Расіі прыгоннага права дзелавая актыўнасць у Гомелі прыкметна павялічылася, праз год пачалося будаўніцтва Лібава-Роменскай чыгункі, якая злучыла Украіну з Прыбалтыкай, а таксама Палескай чыгункі, што злучыла ўсю паўднёвую частку сучаснай Беларусі, Польшчу, Украіну. Усё гэта прывяло да вельмі хуткага прытоку насельніцтва. Для вырашэння надзённых пытанняў гарадскога жыцця неабходна была паўнацэнная фінансавая ўстанова.

Магчыма, менавіта таму 8 студзеня 1870 года быў падпісаны Сенацкі ўказ аб заснаванні ў Гомелі гарадскога грамадскага банка. Яго асноўны капітал пры заснаванні быў вызначаны ў 20 тысяч рублёў. У музейным фондзе Нацыянальнага банка захоўваецца чэк гэтага банка — неаспрэчны "рэчавы доказ" існавання банка.

Як і многія іншыя гарадскія банкі, гэта першая ў Беларусі прыватная камерцыйная грашова-крэдытная ўстанова выдавала доўгатэрміновыя пазыкі пад заклад гарадскіх і будаўнічых участкаў. Капітал гэтых банкаў ствараўся са сродкаў гарадскога бюджэту, а крэдытаваліся ў асноўным сярэднія і дробныя прадпрымальнікі. Крэдыты даваліся таксама гарадской управе, мясцоваму земству, а прыбытак ад аперацый адлічваўся на патрэбы гарадскога добраўпарадкавання і дабрачынныя мэты. Затым свае гарадскія банкі, апрача Гомеля, з'явіліся ў Полацку, Віцебску, Барысаве, Магілёве, Ігумене.

Як падкрэсліваюць у Нацбанку, больш ранняй даты стварэння банкаў на тэрыторыі Беларусі не ўстаноўлена. Такім чынам, пачатковай датай у гісторыі банкаўскай сістэмы Беларусі варта лічыць дату стварэння Гомельскага гарадскога грамадскага банка — 8 студзеня 1870 года.

Витебские власти сделали подарок

Малообеспеченные категории жителей Витебска получат к Новому году по 175 тысяч белорусских рублей.

Основные выплаты продлятся до 30 декабря. Материальную поддержку в размере не менее пяти базовых величин из средств местных бюджетов получат жители аналогичных малообеспеченных категорий граждан и других регионов Витебской области.

Единовременная материальная помощь из средств городского бюджета будет оказана многодетным, неполным семьям и семьям неработающих инвалидов, воспитывающим несовершеннолетних детей; семьям, воспитывающим детей-инвалидов в возрасте до 18 лет; неработающим одиноким пенсионерам; неработающим одиноким инвалидам 1-й, 2-, 3-й групп; лицам из числа детей-сирот в возрасте от 18 до 23 лет; лицам из числа детей, оставшихся без попечения родителей, в возрасте от 18 до 23 лет.

АКТУАЛЬНАЯ ТЭМА

Трымайце кішэню шырэй!

Як жыхар Оршы Васіль Гаўрылавец спрабаваў дамагчыся ад дзяржавы індэксацыі свайго банкаўскага ўклада пасля дэвальвацыі, і што з гэтага атрымалася.

Тое, як "лапухнуліся" беларусы, якія паверылі дзяржаве і зрабілі на пачатку гэтага года ці яшчэ раней банкаўскія ўклады ў беларускіх рублях, расказваць не трэба. Але ж верылі...

Напрыклад, у лістападзе 2010 года Аляксандр Лукашэнка ў сваёй перадвыбарнай праграме абяцаў: *"Будуць забяспечаны стабільнасць курса беларускага рубля, абсалютная захаванасць прыватных укладаў, даступнасць банкаўскага крэдыту..."*

Выбары прайшлі. У сакавіку гэтага года ўжо Нацыянальны банк Беларусі выдае прэс-рэліз: *"У сувязі са з'яўленнем у апошні час правакацыйных чутак аб магчымай рэзкай дэвальвацыі нацыянальнай валюты, якія атрымалі шырокае распаўсюджванне дзякуючы асобным СМІ і сетцы Інтэрнэт, Нацыянальны банк паведамляе, што гэтыя чуткі ніякім чынам не адпавядаюць рэчаіснасці. Акрамя таго, змяненні абменнага курса беларускага рубля, якія выходзяць за рамкі параметраў, што ўстаноўлены Асноўнымі накірункамі грашова-крэдытнай палітыкі Рэспублікі Беларусь на 2011 год, не плануюцца і праводзіцца не будуць... У даны момант для забеспячэння ўстойлівасці нацыянальнай валюты Нацыянальны банк валодае ўсімі неабходнымі як манетарнымі інструментамі, так і золатавалютнымі рэзервамі. Іх узровень цалкам дастатковы для падтрымання стабільнасці беларускага рубля..."*

Вось такія "ласункі" людзям абяцалі, але на выхадзе атрымаўся поўны "пшык". Беларускія рублі абясцэніліся ў адносінах да долара амаль у тры разы, выраслі цэны, а адпаведна "пагарэлі" і банкаўскія ўклады ў беларускіх рублях. Жыхар Оршы Васіль Гаўрылавец справядліва вырашыў, што дзяржава, "як гарант стабільнасці і справядлівасці", павінна адказваць за свае словы, і звярнуўся ў Нацыянальны банк па пытанні індэксацыі свайго ўклада.

— Я паверыў, што мой рублёвы ўклад не "згарыць", але атрымліваецца, што мяне элементарна падманулі, — кажа ён. — Таму і звярнуўся ў Нацбанк з просьбай праіндэксаваць грошы, якія я паклаў у "Беларусьбанк". Дарэчы, наколькі мне вядома, такіх зваротаў — мноства. На станоўчае вырашэнне пытання, калі казаць шчыра, я і не разлічваў, але хацелася даведацца, як будуць апраўдвацца...

Адказ з Нацыянальнага банка Васілю Гаўрылаўцу прыйшоў у жніўні за подпісам намесніка старшыні праўлення Нацбанка С.Дубкова. І зараз спадар Гаўрылавец ужо ведае, хто вінаваты ў яго няшчасцях. Аказваецца, што... сусветны крызіс! Вось толькі некаторыя вытрымкі з адказу аршанцу:

"...Сусветны фінансавы крызіс абумовіў пагаршэнне ўмоў функцыянавання нацыянальнай эканомікі, што адбілася на экспарце айчынных тавараў і прывяло да скарачэння валютнай выручкі, росту запазычанасцяў і іншых негатыўных тэндэнцый. На працягу некалькіх гадоў Нацыянальнаму банку сумесна з Урадам удавалася падтрымліваць стабільнасць беларускага рубля, высокі ўзровень заробкаў і жыцця насельніцтва. Але ва ўмовах перавышэння попыту насельніцтва на імпартную прадукцыю і скарачэння попыту на тавары айчыннай вытворчасці з боку замежных партнёраў, росту цэн на энерганосьбіты ў краіне пачаў адчувацца недахоп замежнай валюты. Сітуацыя яшчэ больш пагоршылася з-за росту ажыятажнага попыту з боку насельніцтва на замежную валюту, у тым ліку — для пакупкі легкавых машын. Для задавальнення ўзрослага попыту на замежную валюту былі затрачаны значныя золатавалютныя рэзервы дзяржавы.

...Нацыянальны банк прыняў усе меры, якія залежалі ад яго, па стабілізацыі сітуацыі на ўнутраным валютным рынку. У гэтай сітуацыі паслабленне беларускага рубля аказалася вымушанай мерай, якая накіравана на карэкціроўку знешніх і ўнутраных дысбалансаў эканомікі, бо ўстойлівасць нацыянальнай грашовай адзінкі залежыць ад эфектыўнасці ўсёй эканомікі, яе канкурэнтаздольнасці, тэмпаў росту вытворчасці працы (у параўнанні з заробкам), прыбытку ад рэалізацыі тавараў і паслуг як унутры краіны, так і на знешніх рынках і многіх іншых фактараў.

Звяртаем Вашу ўвагу на той факт, што сума зберажэнняў у беларускіх рублях, якія знаходзяцца на банкаўскіх укладах (дэпазітах), не зменшылася, а змяніўся валютны эквівалент укладаў у выніку змянення курса беларускага рубля ў адносінах да замежных валют. Аднак варта ўлічваць, што пакупніцкая здольнасць грашовых сродкаў на ўнутраным рынку ацэньваецца з улікам узроўню інфляцыі. Падтрыманне пакупніцкай здольнасці зберажэнняў, якія даверылі банкам, ажыццяўляецца шляхам працэнтнай палітыкі".

Далей Васілю Гаўрылаўцу растлумачылі, што Нацыянальны банк пастаянна павышае стаўку рэфінансавання, каб кампенсаваць інфляцыйныя страты, але напрыканцы дадалі: *"Разам з тым дзеючае заканадаўства не ўтрымлівае норм, якія рэгламентуюць абавязацельствы дзяржавы па абароне зберажэнняў насельніцтва ад змянення курса беларускага рубля ў адносінах да замежных валют і захаванні суадноснага эквіваленту ў замежнай валюце".*

Вось з гэтага, як мне падаецца, і трэба было пачынаць. Галоўная фраза ва ўсім гэтым адказе — **"заканадаўства не ўтрымлівае норм, якія рэгламентуюць абавязацельствы дзяржавы па абароне зберажэнняў насельніцтва ад змянення курса беларускага рубля ў адносінах да замежных валют"**. А "сусветны фінансавы крызіс", як і вайна, усё спіша. І ніхто нікому не павінен...

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

СУСЕДЗІ

Беларускія «чаўнакі» накіравалі ліст прэм'ер-міністру Польшчы

Аб гэтым паведамляе "Kurier poranny". У лісце падпісанты просяць аднавіць хаця б адзін рэйс у дзень цягніка Чарэмша—Высокалітоўск.

Раней гэты цягнік двойчы ездзіў у Беларусь, але ад 11 снежня цягнік больш не курсіруе. У ім у асноўным ездзілі беларускія гандляры.

Ліст да прэм'ер-міністра Польшчы па гэтай справе таксама накіравала Агульнапольская асацыяцыя "Прыязны транспарт". *"Збор беларусамі подпісаў — гэта крык роспачы. Людзей паставілі да сцяны. І мы, палякі, якія так хвалімся, што змагаемся за дэмакратыю на Усходзе, цяпер кажам — пачакайце, перажывіце гэты час ізаляцыі",* — гаворыцца ў звароце арганізацыі.

КАШАЛЁК

Крэдытаў набралі, але як аддаць?

З пачатку года на 38,2% узрос аб'ём крэдытавання банкамі фізічных асоб у нацыянальнай валюце і дасягнуў планкі ў 29,125 трыльёна рублёў на 1 снежня 2011 года.

Пра гэта сведчаць даныя Нацыянальнага банка Беларусі. Праблемная запазычанасць (гэта даўгі, па якіх людзі не могуць разлічыцца) дасягнула 102 мільярдаў рублёў, і тым самым з пачатку года ўзрасла ў 2,9 раза.

Праблемная валютная запазычанасць на 1 снежня склала 24 мільёны долараў, павялічыўшыся на 10,6 працэнта за студзень—лістапад.

Сумарны аб'ём крэдытаў насельніцтву ў пераліку на беларускія рублі на 1 снежня склаў 31,3 трыльёна. Праблемныя крэдыты склалі 308,7 мільярда ў эквіваленце, што ў 3 разы больш, чым на пачатак года.

ЕВРОСОЮЗ

Анатолий МИХАЙЛОВ:

«Наши выпускники обладают свободой выбора карьеры»

*О ценностях европейского образования, о том, что оно дает молодым людям, корреспондент "Народной Воли" беседует с ректором Европейского гуманитарного университета, профессором **Анатолием МИХАЙЛОВЫМ.***

— Анатолий Арсеньевич, после вступления Литвы в Евросоюз изменилось ли что-то в работе вашего университета, который находится в Вильнюсе?

— Безусловно. Мы находимся в стране, которая также переживает весьма непростые трансформационные процессы. Они заключаются, прежде всего, в преодолении того тоталитарного прошлого, безжизненность которого проявилась 20 лет назад, когда прежняя система распалась в одночасье. Сегодня, два десятилетия спустя, становится более очевидным, что эти процессы существенно сложнее, чем представлялись раньше. В качестве члена Евросоюза Литва, в частности, приступила к радикальному реформированию своей системы образования. Наш университет является участником этого процесса. Располагая дополнительными возможностями для своего развития в рамках формирования единого европейского образовательного пространства, мы приходим в большей мере к пониманию того, что образование — это не просто усвоение определенного содержания, не только работа в учебной аудитории или библиотеке, но и возможность приобщения к той жизненной реальности и ее процессам, переживающим столь необходимые социальные преобразования.



— Характер проекта под названием "Европейский гуманитарный университет", наверное, был обозначен уже самим названием университета…

— По самой своей сути идея создания Европейского гуманитарного университета в Минске была обусловлена критическим отношением к самим себе и своему собственному интеллектуальному состоянию. После десятилетий губительной изоляции гуманитарных дисциплин от всего происходящего в исследованиях и образовании в цивилизованном мире, господства тотального идеологического контроля, в конечном счете приведшего к распаду всей социальной системы, мы отдавали себе отчет в том, что перед нами длительный период крайне напряженных усилий по наверстыванию упущенного в самом характере нашего понимания сути социальных процессов. Известно, однако, что такие настроения в начале 90-х разделялись далеко не всеми. Существовала уверенность в том, что наше интеллектуальное состояние и наша компетентность являются достаточными для понимания и осуществления сложнейших социальных преобразований. Что из этого получилось — всем известно.

— Вы сейчас наблюдаете за тем, что происходит в белорусских вузах?

— Не хотел бы об этом судить. В свое время я ушел из БГУ, когда уже был избран академиком Академии наук Беларуси и являлся заместителем председателя совета кафедр общественных наук университета, с полным пониманием того, что положение дел в этой сфере практически безнадежно и не поддается реформированию. Очень хотелось бы надеяться, что с тех пор произошли изменения к лучшему...

— Есть ли какие-то преимущества у выпускников ЕГУ в сравнении с белорусскими коллегами?

— Думаю, у наших выпускников имеются достаточные условия для самореализации, и многое зависит от того, каким образом они сумеют ими воспользоваться. Я, разумеется, не могу утверждать, что мы в полной мере удовлетворены состоянием уровня исследований и преподавания в нашем университете. Вместе с тем у студентов появились новые возможности, которых раньше не было.

— Дипломы ЕГУ признаны в Европе?

— Не только в Европе, но и в мире. Единственным исключением, по-видимому, является Беларусь, в которой степень бакалавра до сих пор остается лишенной своего легитимного статуса. Наши выпускники обладают свободой выбора своей профессиональной карьеры. Многие из них продолжают свое дальнейшее обучение в странах Евросоюза и Северной Америки. Образовательный процесс нацелен на качественную профессиональную подготовку тех, в ком нуждается, прежде всего, Беларусь. Однако реализовать эти навыки возможно как в самой Беларуси, так и за ее пределами.

— Насколько известно, европейские структуры активно поддерживают ваше учебное заведение…

— Само существование ЕГУ в Минске и в Вильнюсе было возможно только благодаря поддержке стран Европы и Северной Америки. В настоящее время эта поддержка выражается в том, что никто из студентов нашей страны не покрывает расходов, затрачиваемых на их обучение, а некоторые из них получают и существенную дополнительную финансовую поддержку. Помимо этого, студенты обладают широким спектром возможностей, которыми располагает ЕГУ как один из европейских университетов. Мы являемся участником многих европейских проектов, которые реализуются в рамках отстраивания единого европейского образовательного пространства. Наши студенты могут знакомиться с работой Европарламента, Совета Европы, они участвуют в наблюдении за выборами в различных странах, интегрированы в различные европейские студенческие структуры. Есть различные возможности для общения. Перед студентами выступали прежний и нынешний президенты Европарламента, премьер-министры и министры, известные общественные деятели, а также пользующиеся признанием представители науки, культуры, искусства.

— Анатолий Арсеньевич, а что, на ваш взгляд, сегодня больше всего беспокоит студентов? Какими проблемами они живут?

— Думаю, что главной заботой всех студентов сейчас является их собственное профессиональное становление. В сфере социальных и гуманитарных дисциплин добиться этой цели особенно непросто. Мы видим, что в XXI веке мир сталкивается с беспрецедентными вызовами, по отношению к которым попытки решения возникающих проблем далеко не всегда приводят к желаемым результатам. Озабоченность состоянием дел в сфере образования, тревога по поводу его недостаточной эффективности, сознание неспособности университетов реагировать на крайне динамичные общественные процессы были характерны и для XX века. Но сегодня образование рассматривается все в большей мере в качестве фактора и необходимого условия выживания в современном мире. И всякая самоуверенность или самодовольство по поводу якобы уже существующего высокого качества образования являются крайне губительными и опасными для общества. В этом случае крайне серьезному риску подвергается будущее молодого поколения. Это означает, что образование не должно сводиться к простой трансляции определенной суммы знаний. Необходимо способствовать формированию творческого мышления, противостоящему соблазну оперирования готовыми теоретическими схемами. В рамках учебного процесса следует, скорее, "озадачивать" мышление, сталкивать его с проблемами, погружать в водоворот, зачастую, не подлежащих "окончательному" решению проблем, а не навязывать некое унифицированное представление, которого нет и не может быть в гуманитарном знании.

— Студенты ЕГУ имеют практическую возможность быть вовлеченными в процессы трансформации европейского образования?

— Конечно. Как известно, Болонская декларация является одним из ответов стран европейского континента на многообразные вызовы современного глобального мира. Не буду перечислять все элементы того, что инициируется Болонским процессом и другими документами, направленными на реформирование европейского образования. Но, прежде всего, это отказ от жесткого государственного регулирования автономии университетов, а также мобильность студентов. По своему опыту помню, как теперь, уже в достаточно далекие времена, мне пришлось пережить своего рода интеллектуальный шок от погружения в другую языковую реальность, когда пришлось столкнуться с проблематикой, к осмыслению которой я был просто не готов. Однако в дальнейшем этот опыт экзистенциального потрясения во многом оказался весьма полезным. Болонская модель делает такого рода студенческий обмен необходимым элементом образовательного процесса. Это способствует не только теоретическому, но и практическому приобщению к смысловым горизонтам иных культур и исторических традиций.

Алесь СИВЫЙ.

КОРОТКО

Для тех, кто желает в Евросоюз...

Еврокомиссия завершила формирование ряда программ поддержки реформ в странах, желающих присоединиться к Евросоюзу, — объем фондирования составит почти 1 миллиард евро.

Эти средства будут доступны Албании, Боснии и Герцеговине, Хорватии, Македонии, Черногории, Сербии, Косово, Турции и Исландии. Наибольший объем средств планируется предоставить Турции — 232,968 миллиона евро и Сербии — 178,557 миллиона евро. Финансирование выделяется из совместного бюджета Евросоюза.

"Эти программы созданы для достижения конкретных результатов в улучшении государственного управления, системы правосудия, экономики и окружающей среды", — сказал еврокомиссар Штефан Фюле.

По стандартам ЕС, страны, желающие присоединиться к союзу, должны удовлетворять определенным требованиям в сфере госуправления, права, экономики, для чего им нередко приходится проводить внутренние реформы, сообщили РИА "Новости".

Калининградцам Европа дала преференции

Европейский парламент дал согласие на решение Совета Евросоюза предоставить Польше и российской Калининградской области режим малого приграничного передвижения, благодаря которому все жители самого западного региона России смогут путешествовать по северу Польши без шенгенской визы.

Накануне председатель Европарламента Ежи Бузек в интервью "Российской газете" назвал малое приграничное движение между Калининградской областью и севером Польши "уникальной ситуацией, заслуживающей уникального подхода".

Соглашение позволит в безвизовом режиме жителям Калининградской области посещать часть Поморского воеводства, в частности, так называемое Троеградье — Гдыню, Гданьск, Сопот, а также Мальборк и часть Варминско-Мазурского воеводства — Эльблонг, Лидзбарк, Бартошице, Ольштын, Мронгово, Гижицко. Поляки, проживающие на этой территории, имеют право находиться без шенгенской визы на всей Калининградской области непрерывно до 30 дней, а в целом 90 дней в течение полугода, но без права на осуществление трудовой или предпринимательской деятельности.

Границы без барьеров

Во время поездок по странам Евросоюза граждане ЕС осознают, что они не только итальянцы, латыши или ирландцы. Во многих европейских странах на границе не проверяют паспортов, если вообще эти границы можно увидеть, переезжая на машине из Германии, скажем, в Голландию или на поезде из Бельгии по Францию, сообщает радиостанция "Немецкая волна".

Страховой полис, заключенный в стране проживания, действует и за ее пределами. Платить хоть в Португалии, хоть в Финляндии можно одной валютой. Евро ввели у себя уже 13 стран ЕС. Единые стандарты на всей территории Европейского Союза действуют во многих других сферах.

Например, в телекоммуникации. Когда-то, во времена монополии "Телекома", жители Германии не имели возможности выбирать телефонную компанию. Но сейчас каждый может решать сам, услугами какого оператора связи пользоваться. Сотовый телефон с немецким номером исправно работает хоть в Италии, хоть на Канарских островах, при этом цены на роуминг уже снижены.

Бонусы потребителям

В Евросоюзе действует целый ряд директив, направленных на защиту прав потребителей.

Например, отменили рейс самолета — пассажир получает компенсацию. Другой пример: генетически модифицированные продукты питания должны быть соответствующим образом помечены. Европейский Союз продолжает укреплять и свой внутренний рынок, помогая слабым регионам, инвестируя деньги в развитие их инфраструктуры.

От строительства новых дорог и аэропортов выигрывают все жители Евросоюза. Но если они чем-то недовольны, то имеют право подавать жалобы на Евросоюз. Петиции принимает специальная комиссия Европейского парламента.

Александр ПАВЛОВ.

Васіль ЗУЁНАК

Вершы з блакнотных старонак

Вёска Мачулішча Халопеніцкага (цяпер Крупскага) раёна, дзе ў 1935 годзе нарадзіўся Васіль Зуёнак, куток па-свойму адметны: з навакольных мясцін адны крыніцы бруяцца, жывячы плыні Дняпра, іншыя — Заходняй Дзвіны. Пэўна, гэты геаграфічны перавал (і гістарычны — на шляху "з варагаў у грэкі") нейкімі магнетычнымі сіламі скіроўваў дарогі і сцежкі паэта...



Скончыўшы Узнацкую сямігодку, Васіль Зуёнак вучыўся ў Барысаўскім педвучылішчы, потым у Беларускім дзяржаўным універсітэце. Дыплом журналіста творча звязаў яго лёс з газетна-часопіснай працай. Быў галоўным рэдактарам часопісаў "Бярозка" і "Маладосць".

З 1982-га па 1990 год — сакратар, а з 1990-га па 1998-ы — старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі. Аўтар каля трох дзясяткаў кніг — паэзіі, вершаў для дзяцей, літаратурнай крытыкі і публіцыстыкі. Выбраныя творы сабраны ў двухтомным выданні: першы том — "Гронка цішыні" — вершы; другі том — кніга паэм "Пяцірэчча". У 2010 годзе выйшла кніга выбранага ў серыі "Беларускі кнігазбор". Творы Васіля Зуёнка перакладаліся на мовы іншых народаў, і сам паэт не быў староннім ад перакладчыцкай справы...

Васіль Зуёнак — лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Янкі Купалы, так была адзначана паэма "Маўчанне травы". Кандыдат філалагічных навук. Ганаровы член Нацыянальнай акадэміі навук Рэспублікі Беларусь.

Быў камунізм...

*Быў камунізм у нас ваенны:
Усіх на прыцэл рэвалюцыя брала,
Кроў на чарніла з буржуйскіх венаў
Для пераможных рэляцый смактала.
І назначаў ад хістанняў лекар
Таблеткі д'ябальскія бальшавізму
З крутым рэцэптам: "Цыц, недарэкі,
А то як дрызну па арганізму!.."
Быў камунізм у нас сусветны
І для пачатку шабляй над Віслай,
Як над буржуйскаю апраметнай,
З кавалерыйскім наскокам бліснуў.
Ды перакрылі буржуі дарогу,
Свет ахінуўшы варожай смугою.
Нас да крамлёўскіх вярнулі парогаў
Рэвалюцыйныя раны загойваць...
Быў камунізм у нас папяровы —
З рэзалюцыйным жылі размахам,
І ў папяровых раслі галовах
Будучых дзён папяровыя гмахі.
Ды не хапіла паперы, няйначай,
І пад сцяной на галоўнай плошчы —
Буржуі і сёння ад радасці скачуць! —
Лёг у труне папяровы нябожчык...
Хоць па-ранейшаму да буржуяў
Мы пралетарскай любоўю згараем,
Ды што мы пасеялі, што мы гадуем,
Вырасце што? — як не зналі — не знаем.
Не раскумекаць — як ні пранізвай —
Што з аперацыі выйдзе пластычнай:
Ці скапіталены камунізм,
Ці капіталізм камуністычны?..*

1995

Гісторыя

*...Подчинение Казани...
...Завоевание Перми...
...Покорение Астрахани...
...Борьба с инородцами в Северо-Восточной Сибири...
...Взятие Полоцка...
...Осада и взятие Бендер...
...Странности на Кавказе...*

Загалоўкі-анонсы ў "Истории России с древнейших времен" С.М.Салаўёва

*З пакалення ішло ў пакаленне —
Метастазамі: пакарэнне.
Пакарэнне каго заўгодна:
І зямель, і дзяржаў, і народаў.
Страў інакшых і не варылі,
Як з імперскім душком: "Пакарылі..."
Пакаралі Сібір, пакаралі Каўказ...
Праўда, шыльду мянялі зрэдчас,
І крывавае пакарэнне
Трактавалася вызваленнем.
Ёсць і гэткія ў справе найменні:
Уз'яднанне і далучэнне...
Вызвалялі братоў, вызвалялі суседзяў, —
Ад каго? — А ніхто з "вызвалёных" не ўгледзеў...
І ярмолавы, і ермакі —
Волядаўцы адной рукі:
Пакарэнне ці вызваленне —
Сэнс адзін: стаяць на каленях.
І манарх, і манах, і мужык —
Хто б ні быў, а лічыць прывык,
Што адзіная мэта ў яго:
Як бы дзе ашчаслівіць каго...
А таму — праз вякі — і гісторыя:
Не жыццё, а вайна з непакораю.
Бо вякамі суседзі-народы
Вызваляюцца ад свабоды...*

2000

Мутанты

*Ад знацця няма ныцця:
Двойчы два — не пяць...
Філасофія жыцця:
Сытаму — паспаць.
Кіпцюры і дзюбу май,
І дэбільны лоб:
Ухапіў — і спажывай,
Слёз не лі сіроп.
У арлінага крыла
Крумкачыны лёт —
Ад пасцелі да стала
Ці наадварот...
Волю пузам здабывай,
Кашальком тугім.
Не збяжыць жыцця трамвай,
Робячы кругі...
Днём — звярыныя клыкі,
Ноччу — спіць ашчэр.
Спачываюць слімакі
Ў ракаўках кватэр...*

2001

Замест рэкламы...

*Дрожджы піваварыі
Мройны дух распарылі, —
Глыток, яшчэ глыток...
Ад піва "Аліварыі"
Да святой Кальварыі, —
За крокам крок...*

2002

Стрыптыз

*У арліцы пярынак — сем тысяч,
А ўсяго пяцьсот грамаў вагой.
А таму — і ўзлятае ўвысі,
Як не чуючы цела свайго.
Горы ёсць, ёсць зямля, ды арліца
Мае крылы, каб неба мець...
...Распранаюцца маладзіцы:
Дужа хочацца — узляцець!..*

2004

Амаль па Маякоўскаму...

*Каб жыццём на зямлі зацяжарыцца,
Нават неба шукае глебу...
Калі мафія нараджаецца,
Значыць, гэта камусьці трэба?.*

2004

Спартыўная элегія

*Стадыёна гіганцкае вуха,
Я табою эпоху слухаў,
Я цябе скіроўваў у неба... —
Мы свой матч не прайгралі ганебна.
Мы былі тады маладыя,
І каму пафарціць удача,
Не гадалі:
Надзея — як мячык, —
Круглы ён: выйгрыш дасць ці адыме?..
Мы не пнуліся ў касталомы,
Спадцішка не стаўлялі падножкі.
А на трапны ўдар, як вядома,
Не хапае спрыяння трошкі...
Мы згулялі — няхай па нулях, —
Перамогам пазначыўшы шлях.
Сёння крута шуміць стадыён —
Гандляром абярнуўся ён
І не ў неба наставіў вуха:
Для яго там і пуста, і глуха.
Бо другое ў яго захапленне:
Не прафукаць бізнес-імгненне.
Не паказвае сёння табло,
Колькі лічбаў хавае трыбло.
Сёння спрынтэры тут і стаеры —
Учарашнія уркі і фраеры, —
Пераможцы, бізнесу гранды...
Толькі гэта не з нашай каманды.*

2005

* * *

*Чалавек, разумная малпа...
Столькі год з навуковых гармат
Па тварэнню боскаму залпам
Дарвін б'е — і ўсё неўпапад.
Недалёты ды пералёты,
А па Богу — ніяк не ўцэліцца!..
Што было да хаосу? — а потым
Будзе што? Зноў хаос узмяцеліцца?!.
Пазнавальны, але да бясконцасці, —
Недаступнасцю свет лякае.
Скажа хто: эвалюцыя коціцца, —
А куды? І па ліку якая?!.
Чалавецтва прыроды аковы
Разбурае — і з д'ябальскай пробаю
(Быццам Бог даў шлях тупіковы...)
З чалавека стварае робата.
Чалавецтва мяняе матрыцы, —
Пот — цурком з геніяльных лысін...
Пасміхаецца малпа ў Афрыцы:
Чалавецтва, не памыліся!..*

2006

Бяседаю і песняй...

Нілу Гілевічу

*Гучыць над нашым краем:
"Радзіма дарагая..."
А мы ўсё паміраем,
А нам дапамагаюць.
Дапамагаюць зверху,
Дапамагаюць знізу,
Каб кожны з нас паверыў,
Што гэта — камунізм.
Што свет стары ўхітрыцца
Пры новай жыць абнове:
Сварыцца і мірыцца
Ўсім на адзінай мове.
А нам да гэтай пploймы
Далёка — ой далёка!
А мы яшчэ па-свойму
Нязломкі пагалёкаць.
Як з Нараччу Палессе,
Як Нача з Панямоннем:
Бяседаю і песняй —
Гамонім і гамонім!
Бо запавет Францішка
Трактуе, "каб не ўмёрлі":
Ёсць мова — нас не знішчыць
Камяк задухі ў горле.
Ёсць мова — мы паўстанем
Сваю душу агучыць.
І свет складзе паданні
Пра нашу неўміручасць.*

2011

FEMEN абвясцілі вайну беларускім чыноўнікам

Рух украінскіх феміністак заклікаў прызнаць персонамі нон-грата ва Украіне ўсіх чыноўнікаў і афіцыйных прадстаўнікоў беларускай улады.

"Мы пачынаем ва Украіне кампанію па прызнанні персонамі нон-грата ўсіх афіцыйных асоб і чыноўнікаў з Беларусі, калі яны з'яўляюцца прадстаўнікамі ўлады. Мы маем намер праследаваць любога такога чыноўніка ў сваёй краіне. Таму раім ім добра падумаць, перш чым ехаць ва Украіну", — заявіла кіраўнік руху Ганна Гуцол у інтэрв'ю "Еўрарадыё".

ТЫМ ЧАСАМ

Былы пасол Украіны ў Беларусі Раман Бязсмертны лічыць, што Віктар Януковіч павінен адклікаць амбасадара і знізіць узровень свайго прадстаўніцтва ў Мінску.

Паводле яго слоў, *"перш за ўсё павінна была прагучаць жорсткая заява ўкраінскага МЗС, а далей наш амбасадар у Беларусі павінен быў прыняць меры, якія паспрыялі б пошуку зніклых украінскіх грамадзян. Нарэшце, Кіеў мог бы знізіць узровень свайго прадстаўніцтва ў Мінску, адклікаўшы для кансультацый амбасадара".*

"На гэтыя дзеянні МЗС Украіны не павінна ўплываць тое, чым займаліся ў Беларусі актывісткі Femen. Яны — украінскія грамадзяне, а ў Беларусі ў мінулым бясследна зніклі апаненты прэзідэнта. Наша краіна павінна была імгненна заявіць аб падтрымцы сваіх грамадзян", — заявіў Бязсмертны ўкраінскім СМІ.

Афіцыйныя прадстаўнікі МЗС наконт інцыдэнту заявілі, што чакаюць вынікаў афіцыйнага расследавання, якое паабяцалі правесці беларускія праваахоўныя органы.

ПАСТФАКТУМ

Палякі не паверылі

"НКУС не забіла ў Беларусі ніводнага паляка", — заявіў Аляксандр Лукашэнка ў адказ на пытанне польскага журналіста пра "беларускія спісы" расстраляных у 1939 годзе польскіх афіцэраў. Вядучая польская газета „Rzeczpospolita" лічыць, што кіраўнік Беларусі падманвае.

"Гэта не толькі хлусня, але і бязмежная крывадушнасць, — заявіў польскаму выданню прафесар Войцех Матэрскі. — *Лукашэнка выкарыстоўвае польскую трагедыю ў гульні з Масквой. Калі ён сварыўся з Крамлём, то намякаў, што аддасць палякам спіс. Цяпер жа, калі ён пагадзіўся з Масквой, зноў забыў пра гэты спіс".*

"Гэта з'яўляецца апошняй катынскай таямніцай. НКУС забіла ў Беларусі 3782 палякі, якія знаходзіліся ў той час у турмах на тэрыторыі БССР. Па сённяшні дзень невядомыя дадзеныя тых людзей, а таксама месца іх расстрэлу і пахавання", — піша выданне.


Паводле меркавання іншага гісторыка Збігнева Сямашкі, "заявы Лукашэнкі — поўная лухта". Ён нагадаў, што з савецкіх дакументаў вядома пра расстрэл палякаў у Беларусі, бо мінскае НКУС атрымала з Масквы расстрэльныя загады. Таксама як ва Украіне ў 1940 годзе польскіх вязняў прывезлі ў мінскую турму. Далейшы іх лёс невядомы. *"Лічыцца, што іх расстралялі ды пахавалі ў Курапатах альбо іншым сакрэтным месцы НКУС. Вось ужо 20 год расійскае кіраўніцтва не хоча перадаць палякам адпаведныя дакументы па гэтай справе. Гісторыкі лічаць, што ў Беларусі можа захоўвацца копія. Пра гэта сведчаць украінскія матэрыялы: у Кіеве захавалася копія ўкраінскага спісу, якую афіцыйны Кіеў перадаў палякам. Больш за тое, савецкі НКУС вёў вельмі дакладную дакументацыю сваіх злачынстваў, таму словы Лукашэнкі не вартыя даверу",* піша польскае выданне.

ШАШКІ

Сярэбраны і бронзавы медалісты

У Санкт-Пецярбургу адбылося першынство свету па бліц-гульні ў шашкі-64. Выдатна выступілі ў ім прадстаўнікі Беларусі: міжнародны майстар з Гомеля Яўген Кандрачэнка заваяваў сярэбраны медаль, гросмайстар Андрэй Валюк з Мінска — бронзавы. Чэмпіёнам жа стаў Сяргей Белашэеў (Украіна).

Я.Кандрачэнка перадаў нам па электроннай пошце павучальны эпізод спаборніцтва:



Белыя (С.Белашэеў): c1, c3, d2, d4, e1, e3, f4, h2, h4, h6 (10). **Чорныя** (Я.Кандрачэнка): a3, a5, a7, b6, d8, e7, f6, f8, g7, h8 (10). Чорныя аслабляюць левы фланг белых: 10...bc5 11. d:b6 a:c7 12. fg5 cd6 13. ed4 ab6 14. ef2 ba5 15. de3 dc5 16. d:b6 a:c7 17. ed4 cb6 18. hg3 dc7 19. gf4 ba5 20. fe3 cd6 21. cd2. І далей чорныя гулялі ў тым жа духу і завяршылі партыю невялічкай камбінацыяй. Пашукайце яе ў рамках нашага **бліца-76/4**.

Дамачныя праблемы

З такімі кампазіцыямі мы ўжо знаёмілі вас па шашках-64. Бываюць яны і ў стоклетках:

1.**Белыя**: 15, 25, 27, 28, 32, 33, 36, 39, 41 (9). **Чорныя**: 8, 16, 18, 19, 21, 24, 26, 29, дамка 5 (9). Выйгрыш: 31, 28-22, 34, 3, 10, 27 (24A) 38 (30) 43 (35) 49х. A(23) 38! (28) 27/49 (33) 43х.

2.**Белыя**: 16, 18, 19, 27, 29, 31, 33, 34, 43, 50 (10). **Чорныя**: 2, 7, 8, 9, 11, 20, 26, 30, 35, 45, дамка 48 (11). Таксама перамога белых: 34, 1, 7, 6, 42! (40) 33, 39, 6х.

3.**Белыя**: 15, 25, 27, 28, 32, 33, 39 (7). **Чорныя**: 5, 9, 16, 19, 21, 24, 29, дамка 46 (8). Перавага на баку белых з-за іх лепшай пачатковай расстаноўкі і першага ходу. Пераканайцеся ў гэтым самі.

***

Чакаем адказы на працягу двух тыдняў па адрасе**: 220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а, рэдакцыя газеты "Народная Воля", рубрыка "Шашкі".**

Рашаем разам

Бліц-76/3 (М.Пустыннікаў): дэманструецца камбінацыйная гульня ў задачы — 1. dg7 b:g1A 2. gf6!! gf2/b6 3. a:g1#. A1...h:h4 2. cb4! 3. ab8 4. be1 h:e5/c7 5. b:h2#.

"Галоўны элемент" (М.Грушэўскі): **№ 3**. 3, 28, 1, 11, 10, 12!х.

Мікалай ГЛАДКІ.

ШАХМАТЫ

Решите задачу
В.Трояновский

Белые: Крh7, Фа5, Лg1, Сe1, Кd4, Кf5 (6).

Черные: Крf4, Сb8, Кd1, пп. a7, e4, g5 (6).

Мат в 2 хода.



Свои ответы присылайте по адресу: **220030, Минск, ул.Энгельса, 34а, редакция газеты "Народная Воля", "Шахматы".**

Лидирует Сергей Азаров

В новом белорусском рейтинг-листе около 600 шахматистов. Впервые на первую строчку взошел 28-летний гроссмейстер из Минска Сергей Азаров — 2667. Успешные выступления в международных турнирах позволили минчанину за под нарастить свой рейтинг на 66 (!) пунктов. На второй строчке недавний лидер гроссмейстер Сергей Жигалко — 2661, на третьей — гроссмейстер Алексей Александров — 2626 (все из Минска). В первую тридцатку также вошли: гроссмейстеры 4.Алексей Федоров (Могилев) — 2579, 5.Андрей Жигалко (Минск) — 2572, 6.Никита Майоров (Витебск) — 2558, 7.Виталий Тетерев (Новополоцк) — 2538, 8.Сергей Каспаров (Могилев) — 2521, 7.Андрей Ковалев (Витебск) — 2513, 10.Вячеслав Дыдышко — 2512, 11.Кирилл Ступак — 2503, 12.Евгений Подольченко — 2484, 13.международный мастер Владимир Романенко — 2473, 14.гроссмейстер Юрий Тихонов — 2450, 15.мастер ФИДЕ Владислав Ковалев — 2446, 16.международный мастер Олег Романов — 2439, 17.гроссмейстер Виктор Купрейчик — 2434, 18.международный мастер Андрей Горовец — 2417, 19.мастер спорта Сергей Михайловский — 2414, 20.международный мастер Николай Алявдин — 2411, кандидаты в мастера 21.Манвел Погосян — 2406, 22.Александр Зажогин — 2400, 23.Дмитрий Буланов — 2386, 24.международный мастер Павел Ломако — 2383 (все из Минска), 25.мастер спорта Владимир Веремейчик (Гродно) — 2383, 26.международный мастер Евгений Мочалов — 2382, 27.международный мастер Валерий Смирнов (Минск) — 2360, 28.мастер ФИДЕ Станислав Цыганчук (Орша) — 2354, 29.международный мастер Дмитрий Новицкий — 2347, 30.гроссмейстер Игорь Люцко — 2342 (Минск).

У женщин список возглавляет неоднократная чемпионка страны международный мастер Наталья Попова — 2314. В первую десятку также входят: 2.международный мастер Надежда Азарова — 2296, 3.международный мастер Анастасия Зезюлькина — 2272 (все из Минска), 4.гроссмейстер Анна Шаревич (Брест) — 2267, 5.гроссмейстер Раиса Эйдельсон (Витебск) — 2254, 6.гроссмейстер Генриетта Лагвилава (Минск) — 2230, 7.международный мастер Татьяна Берлин (Брест) — 2152, 8.кандидат в мастера Екатерина Хомякова (Минск) — 2129, 9.международный мастер Татьяна Каспарова (Могилев) — 2119, 10.кандидат в мастера Ланита Стецко (Минск) — 2116.

ВЫНІКІ ГОДА

Перадалімпійскі!

Некаторыя спартыўныя вынікі 2011 года «Народнай Волі» падводзяць беларускія трэнеры і спартсмены.

Для спартсменаў перадалімпійскі год быў своеасаблівым. Нехта асцярожнічаў, каб не раскрываць усе карты перад Гульнямі, хтосьці працягваў заваёўваць медалі... Але, каб не быць суб'ектыўным у вызначэнні лепшых, мы вырашылі прадаставіць слова спецыялістам, якім прапанавалі даць ацэнку па трох намінацыях:

1. Спартыўная падзея года.

2. Спартсмен года.

3. Самая яркая падзея ў 2011 годзе ў вашым жыцці.

Ірына ЛЕПАРСКАЯ,
галоўны трэнер зборнай Беларусі па мастацкай гімнастыцы:



1. Асабіста для мяне галоўнай падзеяй стала заваяванне дзяўчатамі алімпійскіх ліцэнзій. Што можа быць яшчэ больш раднасага? Думаю, што тыя, хто рыхтуецца да Гульняў-2012, будуць са мной салідарны — нічога больш значнага, чым заваяванне ліцэнзій на Алімпіяду, быць і не магло. А за футболам і хакеем я не сачу.

2. Лепшай спартсменкай назвала б Аляксандру Герасімяню, якая стала чэмпіёнкай свету ў плаванні на 100 метраў вольным стылем. Гэта ж каралеўская дыстанцыя! За Сашу было проста радасна.

3. Мяне вельмі парадавалі гімнасткі на чэмпіянаце Еўропы, калі заваявалі два залатыя медалі. Я гэтага не чакала, але атрымала. Такія прыемныя падарункі не забываюцца! Спадзяюся, што ў наступным годзе і на Алімпіядзе выступім на ўзроўні. Але там ужо — як Божанька дасць.

Вадзім ДЗЕВЯТОЎСКІ,
сярэбраны прызёр Алімпіяды-2008 у кіданні молата:



1. Я хацеў бы адзначыць некалькі падзей, каб кагосьці не пакрыўдзіць. Напрыклад, гэта быў, на мой погляд, цудоўны год для тэнісісткі Вікторыі Азаранка, якая радавала балельшчыкаў сваім паспяховым выступленнем на турнірах. Чэмпіянат свету па лёгкай атлетыцы, што праходзіў у Паўднёвай Карэі, — неардынарны турнір. Заўсёды ж цікава паглядзець на спартсменаў напярэдадні Алімпіяды. Увесь свет сачыў за гэтым, доўгі час абмяркоўвалі фальстарт спрынтара Усэйна Болта. Біятлон і цудоўнае выступленне Дар'і Домрачавай зараз выходзяць на першы план. "Золата" Аляксандры Герасімені ў плаванні. Бліскучае выступленне вадналыжнікаў на чэмпіянаце свету. Адным словам, як мне падаецца, балельшчыкам было чаму парадавацца ў мінулым годзе.

2. Узняў бы на п'едэстал цяжкаатлетку Анастасію Новікаву, якая ў складанай канкурэнцыі з азіяткамі стала першай на чэмпіянаце свету. Гэта вельмі складаны від спорту для жанчыны, а таму я проста здымаю перад Насцяй капялюш.

3. У спорце ў мяне асаблівых дасягненняў няма, бо ідзе перыяд рэабілітацыі, але я займаюся яшчэ і грамадскай работай. Запомніцца мерапрыемства, якое мы арганізавалі на 9 Мая. Гэта было проста прыгожа!

Віктар ЗУЕЎ,
сярэбраны прызёр Алімпіяды па боксе:



1. Чэмпіянат свету па боксе. Няхай не крыўдзяцца на мяне прадстаўнікі іншых відаў спорту, але асабіста для мяне гэта было галоўнай падзеяй года.

2. Алім Селімаў — чэмпіён свету па грэка-рымскай барацьбе.

3. У мяне летам гэтага года нарадзілася другая дачка. Гэта такая падзея, што не перадаць словамі!

Аляксандр СЯДНЁЎ,
галоўны трэнер футбольнага клуба «Дынама» (Мінск):



1. Думаю, ніхто не будзе спрачацца, што галоўная падзея года — гэта тое, што алімпійская зборная Беларусі па футболе патрапіла на Гульні-2012. Калі не памыляюся, ніхто з краін былога Саюза такога поспеху не дабіваўся. Безумоўна, некаторыя адзначаюць, што гэта, маўляў, выпадковасць, халява. Але, ведаеце, нічога выпадковага ў гэтым жыцці не бывае. Нават калі ў нейкім асобным матчы і пашэнціла, то вынік дасягаецца не ў адзін момант. Гэта доўгая работа, якую правялі не толькі цяперашнія трэнеры, але і дзіцячыя, што выхоўвалі футбалістаў.

2. Некаторыя называюць хакеіста Міхаіла Грабоўскага, які гуляе ў Нацыянальнай хакейнай лізе. Праўда, я — не асабліва вялікі спецыяліст у хакеі, а таму свой выбар спыняю на Дар'і Домрачавай і Аляксандры Герасімені.

3. Не буду арыгінальным, калі скажу, што галоўная падзея года асабіста для мяне — футбольны сезон. Калі працаваў у "Белшыне", у каманды быў вельмі цяжкі пачатак. Наогул была нявызначанасць у плане далейшага лёсу клуба, калі на збор паехала 14 чалавек. Шчыра кажучы, было па-сапраўднаму страшна за каманду. Але сезон аказаўся яркім. Зараз я перайшоў у мінскае "Дынама", і вельмі хочацца, каб усё атрымалася і ў мяне, і ў каманды.

Алесь СІВЫ.

ВНЕ ИГРЫ

Чемпион повесил плавки на гвоздь

Шестикратный чемпион мира по плаванию Марк Фостер из Великобритании отказался от участия в Олимпийских играх 2012 года в Лондоне.



41-летний спортсмен заявил в интервью BBC Sport, что для него пришло время завершить карьеру. Ранее Фостер говорил, что он может вернуться в спорт, чтобы принять участие в Олимпиаде.

Фостер четыре раза становился чемпионом мира на короткой воде на дистанции 50 метров вольным стилем. Еще два раза Фостер выигрывал золотые медали на дистанции 50 метров баттерфляем. Олимпийские награды пловец не завоевывал.

В 2006 году Фостер завершил карьеру, однако через год вернулся в спорт, чтобы выступить на Олимпийских играх 2008 года в Пекине. Пловец прошел отбор на Олимпиаду и был знаменосцем сборной Великобритании на открытии пекинских Игр. На самих соревнованиях Фостер выступил неудачно и побороться за медали не сумел.

После Олимпиады-2008 Фостер прекратил выступления, но официально о завершении карьеры не объявлял.

Форсберг признался в сдаче игры

Шведский хоккеист Петер Форсберг признался, что сборная его страны специально проиграла один из матчей хоккейного турнира на Олимпийских играх 2006 года в Турине. Об этом пишет шведское издание Expressen.



По словам Форсберга, шведы сознательно уступили на групповом этапе сборной Словакии (0:3), чтобы избежать встречи с Канадой в 1/4 финала.

О матче со словаками 38-летний Форсберг рассказал во время съемок документального фильма "№21 Петер Форсберг". Хоккеист подчеркнул, что его команда делала все, чтобы выиграть турнир. По словам игрока, в том, что шведам было выгодно проиграть Словакии, виновата схема розыгрыша. Правда, другой игрок сборной Швеции Хенрик Седин, который также участвовал в Олимпиаде-2006, отверг подозрения в сдаче матча, пишет издание Vancouver Sun.

На Олимпийских играх в Турине сборная Швеции заняла третье место в группе после Словакии и России (россиянам шведы проиграли со счетом 0:5), опередив США, Казахстан и Латвию. В 1/4 финала шведская команда обыграла Швейцарию (6:2), в полуфинале — Чехию (7:3), а в решающем матче — Финляндию (3:2).

Форсберг завершил карьеру в начале 2011 года.

Гвардиола покинет «Барселону»?

Главный тренер футбольной испанской "Барселоны" Хосеп Гвардиола не спешит подписывать новый контракт с клубом.



"Люди могут быть спокойны насчет вопроса о продлении моего контракта. Знаю, что делаю. И знаю, когда и как это должно быть сделано. Могу сказать, что количество титулов никак не повлияет на мое окончательное решение. Меня не беспокоят постоянные вопросы о моем будущем. Как только приму решение, сразу сообщу об этом президенту клуба", — приводит слова Гвардиолы официальный сайт клуба.

Как сообщает итальянская пресса, наставник "Барселоны" будущим летом может перейти в миланский "Интер".

Александр НИКОНОРОВ.

ЛУЧШИЕ!

По версии белорусских спортивных изданий "Спортивная панорама" и "Прессбол" лучшим белорусским спортсменом 2011 года назван Алим СЕЛИМОВ, представляющий греко-римскую борьбу, а лучшей спортсменкой — пловчиха Александра ГЕРАСИМЕНЯ.

Напомним, что уроженец Дагестана Алим Селимов в уходящем году стал чемпионом мира по греко-римской борьбе, а Александра Герасименя на чемпионате мира победила в самой престижной дисциплине — стометровке вольным стилем. "Народная Воля" проанализировала, что говорили победители о себе...

Александра ГЕРАСИМЕНЯ: «Замуж пока не хочу...»



— Почему только Герасименя из белорусов выигрывает медали в плавании? Мне сложно ответить на этот вопрос, — говорила Александра в рамках программы "Вне игры". — Конечно, у меня были данные с рождения, все-таки мои родители спортсмены. Я думаю, сказываются гены. Меня с детства приучали к физической культуре. Я хорошо бегала, прыгала. Для меня это было удовольствие. Я была активным ребенком, и движения мне были в радость. Может, поэтому я выбрала спорт. Возможно, есть другие врожденные данные, плавучесть. Все, что мне нравится, я делаю хорошо. Если я захочу что-то сделать, я буду к этому стремиться и добьюсь своего. А ведь в плавание меня привел друг. Пришли покупаться и поиграть... А стала в итоге чемпионкой мира. Спасибо другу!

— Я героиня? Слишком громко сказано. На спортивной арене — возможно. Я понимаю, что на меня все равняются, особенно дети, которые пишут мне, берут автографы, смотрят на меня жадными глазами. Я понимаю, что не могу позволить себе лишнего, потому что это может как-то отразиться на тех, кто за мной наблюдает. Это важно, я считаю, за собой надо следить.

— Мода? Стараюсь за своим гардеробом смотреть сама. Но иногда помогают подруги. Если я в чем-то сомневаюсь, я знаю, кого спросить. Я не могу и не хочу гнаться за модой, потому что не все, что модно, мне пойдет. Я стараюсь находить то, что мне идет, и то, что красиво. Украшения люблю, но ношу очень редко в силу специфики работы. Я плаваю, тренируюсь. Я не могу носить бусы или цепочки, потому что они могут мешать и, не дай Бог, еще задушат. Поэтому мои украшения — медали.

— Есть ли парень? Так, чтобы замуж? Замуж пока не хочу! Почему? А смысл? Меня постоянно нет. Представьте, муж все время остается один. А вдруг я очень ревнивая? И вообще, я еще пока не определилась, каким должен быть молодой человек рядом со мной.

Алим СЕЛИМОВ: «Трохі размаўляю на мове»



— В Беларусь приехал, когда мне было 16 лет, — цитирует спортсмена goals.by. — До этого я жил в Дагестане в поселке Касумкент. Там же закончил 9 классов школы. Параллельно тренировался, иногда ездил на сборы в Махачкалу. Заниматься начал с 9 лет... После средней школы поступил в экономический колледж. Но закончить его не успел, так как появилась перспектива переезда в Беларусь. Дело в том, что я всегда находился в компании друзей, которые были старше меня. И один из моих товарищей — Камал — предложил переехать в Мозырь, где жил его дядя — Малик Эскендеров, который является тренером по борьбе. Все произошло очень неожиданно: мы просто сидели в буфете колледжа, съели по ватрушечке с лимонадиком, заговорили о жизни, и Камал просто говорит: "А давай тебя отправим в Беларусь, там у меня дядя — хороший тренер. Я сейчас сам туда еду". Я сразу же согласился. Ведь ситуация в Дагестане была не из лучших: денег нет, на сборы постоянно приходилось выискивать какие-то средства, а в Беларуси была какая-то перспектива.

— Белорусский язык? Трохі размаўляю. Вельмі цікавае гучанне ў вашай мовы. Понимаю я все, говорить тоже могу. Нельзя же столько лет прожить в стране и не знать языка. Поначалу у меня, правда, плохо получалось. В училище история Беларуси была на белорусском, и мне надо было как-то учить. Так мне мой друг Сергей Перников переводил то, что написано в книге, на русский язык, а я писал конспект и потом учил.

— В Гомеле у меня жена Настя и дочь Эльнара. Сам я мусульманин, и стараюсь соблюдать все традиции. Пять раз в день совершаю намаз. Отмечаю религиозные праздники. Хотя в Беларуси всего-то одна мечеть, да и мусульман немного. Но вот соблюдать пост в Рамадан у меня получается не всегда: все-таки спортивный режим требует нормального питания. Моя жена ислам не приняла, она — христианка. Но не важно, кому молится человек...

Алесь СВЕТЛАНИЧ.

Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а. Прыёмная: тэл. (017) 3286871. Тэл./факс рэкламнага аддзела: (017) 3286904, 3286906 nv@promedia.by
http://www.nv-online.info http://twitter.com/narodnaya_volya

ISSN 2071-9647

Падпісныя індэксы: 63222, 632222

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф Паўлавіч СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі №947 ад 6 студзеня 2010 г. выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Надрукавана ў друкарні РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Падпісана ў друк 26.12.2011 у 17.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж 27720 экз. Заказ №6150.